# Гісторыя

*А.Г. КАХАНОЎСКІ*

## ЭТАПЫ І ШЛЯХІ МАДЭРНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Анализируются этапы, пути и особенности развертывания модернизационных процессов в Беларуси XIX – начала XX в. Обозначены основные направления применения теории модернизации к социально-экономической и этнокультурной истории Беларуси рассматриваемого периода.

The article presents an approach to analyze the stages, ways and peculiarities of developing modernization processes in Belarus during the period of XIX and early XX century. The theory of modernization applied to the social economic and ethnocultural history of Belarus of the mentioned period is identified in major trends.

Гісторыкі лічаць, што чалавецтва зведала дзве найвялікшыя рэвалюцыі: першая – неалітычная – была звязана з пераходам ад прысвойваючай да вытворчай гаспадаркі. Сутнасць другой – мадэрнізацыя – змена традыцыйнага (аграрнага) грамадства індустрыяльным (сучасным). Мадэрнізацыя ўяўляе сабой комплексны працэс, які закранае розныя сферы жыцця – эканамічную, сацыяльную, палітыка-прававую, культурную. З мадэрнізацыяй шчыльна звязаны працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, станаўлення нацыі, змен у менталітэце насельніцтва, фарміравання іерархічнай сацыяльнай структуры грамадства. Мадэрнізацыя ў той ці іншай ступені можа быць ахарактарызавана як вестэрнізацыя, паколькі змены, выкліканыя ёй, народжаны заходняй цывілізацыяй, хаця значна трансфарміраваны з улікам мясцовых умоў і традыцый.

Тэорыя мадэрнізацыі атрымала прызнанне і пашырэнне ў замежнай гістарыяграфіі, дзе створаны значныя тэарэтыка-метадалагічныя напрацоўкі вывучэння яе праблем[1]. Вызначаны фазы, этапы і тыпы мадэрнізацыі. У апошняе дзесяцігоддзе ў сувязі з ростам цікавасці расійскіх даследчыкаў да цывілізацыйнага падыходу аналізу гістарычных працэсаў павялічылася ўвага да праблем мадэрнізацыі сваёй краіны[2]. Аднак гэты накірунак стаў прадметам навуковых дыскусій, якія закранаюць пытанні сутнасці, глыбіні змен у мінулым і на сённяшнім этапе развіцця Расіі.

Вывучэнне працэсаў мадэрнізацыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. у якасці самастойнай комплекснай навуковай праблемы не праводзілася. Асобныя пытанні, у якіх праз парадыгму фармацыйнага падыходу знайшлі адлюстраванне некаторыя працэсы мадэрнізацыі Беларусі (напрыклад, развіццё прамысловасці, гарадоў, эвалюцыя сацыяльнай структуры грамадства і інш.), атрымалі асэнсаванне ў айчыннай і замежнай навуковай літаратуры. Найбольш цытуемымі з'яўляюцца працы М.В. Біча, М.Ф. Болбаса, Л.П. Ліпінскага, В.П. Панюціча, К.І. Шабуні, С.М. Самбук, З.В. Шыбекі[3].

У XVI ст. Беларусь знаходзілася пад прыметным уплывам ідэй Адраджэння і Рэфармацыі, з якімі звязваюць зацвярджэнне ў грамадстве новых ідэалаў і каштоўнасцей. Пратэстанцкая этыка і рэлігія садзейнічалі станаўленню капіталістычнай сістэмы, але ў Беларусі новыя ідэі не знайшлі свайго ўкаранення. Некалькі дзесяцігоддзяў імклівага развіцця рэфармацыйнага

руху змяніліся інтэнсіўнай контррэфармацыяй. Зацвярджэнне пратэстанцкіх ідэалаў засталося нерэалізаванай гістарычнай альтэрнатывай развіцця беларускага грамадства. Эвалюцыя трэцяга саслоўя, якое выявіла свой эканамічны патэнцыял у гарадах Беларусі ў XVI ст., была стрымана ўвядзеннем грабежніцкіх мытных тарыфаў у інтарэсах шляхты і магнатаў. Асобныя з заможных беларускіх гараджан усё ж засведчылі аб сабе ў гісторыі (напрыклад, мецэнаты Ф. Скарыны, кнігавыдаўцы, асветнікі).

У пачатку XVIII ст. адчыняюцца на Беларусі першыя мануфактуры, са з'яўленнем якіх у краінах Захаду часам звязвалі даіндустрыяльную мадэрнізацыю. Эканамічныя поспехі другой паловы XVIII ст. не былі падмацаваны трывалай дзяржаўнай воляй да рэфармавання грамадства. Падзелы Рэчы Паспалітай, змена геапалітычных рэалій, уваходжанне ў склад Расійскай імперыі істотна паўплывалі на накірунак і тэмпы працэсаў, якія праз некалькі дзесяцігоддзяў прывялі да тых змен сацыяльнай і эканамічнай рэчаіснасці на Беларусі, якія можна атаясаміць з мадэрнізацыяй.

У краіне, дзе адбываліся паступовыя змены, цяжка вызначыць момант пачатку мадэрнізацыі. Гэта заўвага тычыцца Расійскай імперыі, усіх яе рэгіёнаў, хаця некаторыя даследчыкі вылучалі Беларусь сярод больш перадавых у XIX ст. і больш блізкіх да станаўлення буржуазнага грамадства[4]. На Беларусі ў 20-х гг. XIX ст. са з'яўленнем першых фабрык і заводаў пачынаецца прамысловы пераварот, але аб індустрыялізацыі, што з'яўлялася стрыжнем мадэрнізацыі, у гэты час можна ўзгадваць з вялікай доляй умоўнасці і толькі як аб першым кроку да яе.

Прамысловая рэвалюцыя фактычна супала па часе з абуджэннем нацыянальна-вытворчых працэсаў, якія з'яўляюцца часткай і вынікам мадэрнізацыі. У гэты перыяд адбываюцца рэабілітацыя і абуджэнне нацыянальных культур і свядомасці. Першыя дзесяцігоддзі XIX ст. паклалі пачатак станаўленню нацыі сучаснага тыпу, а ў тым ліку – першых фаз фарміравання беларускай. У гэты час пачынаюць выдавацца зборы беларускага фальклору, вывучаецца гісторыка-культурная спадчына і ствараюцца першыя музейныя калекцыі, адбываецца станаўленне шматнацыянальнай інтэлігенцыі Беларусі.

Вялікія рэформы 60–70-х гг. XIX ст. сталі вяховай падзеяй развіцця мадэрнізацыйных працэсаў. Вызваленне сялян стымулявала пераход ад сістэмы прымусовай працы да вольнай, а таксама да рыначна-капіталістычных метадаў мадэрнізацыі. У Расійскай імперыі рэформы пранікі ў глыбокія слаі традыцыйнай сацыяльнай рэчаіснасці, таму што гэта было падрыхтавана выяўленнем цэннаснай матывацыі, ментальнымі пераменамі, якія закранулі найперш інтэлектуальную і бюракратычную эліты[5]. З аднаго боку, Беларусь лічылася найбольш падрыхтаванай часткай імперыі да рэформ і выкарыстоўвалася ў якасці своеасаблівага палігона для іх выпрабаванняў (напрыклад, падрыхтоўка да адмены прыгоннага права), а з другога боку, уплыў рэформ тут быў больш абмежаваны з-за асаблівасцей рэалізацыі ўрадавай палітыкі. Паралельна правядзенню рэформ у Беларусі быў уведзены рэжым абмежавальных законаў у дачыненні да католікаў, яўрэяў, замежных грамадзян, ішло змаганне з польскімі ўплывамі. Накірунак рэформ быў скіраваны ў значнай ступені на уніфікацыю беларускіх губерняў з вялікарускім цэнтрам, але вынік аказаўся некалькі нечаканым. Сістэмная мадэрнізацыя суправаджалася абуджэннем этнакультурных працэсаў. Рэформы зрабілі актуальным пытанне аб прыродзе нацыянальнага. Менавіта ў 60–70-х гг. XIX ст. пад непасрэдным уплывам паўстання 1863 г. з'явіўся рускі нацыяналізм [6]. Разам з тым адбывалася фарміраванне і пашырэнне ў Беларусі "заходнерусізму" як ідэалогіі і формы этнічнай самасвядомасці часткі гарадскога насельніцтва. Пад уплывам спрэчак аб гістарычным шляху і месцы Беларусі, актывізаваных не без удзелу прыхільнікаў "заходнерусізму", ствараецца беларуская нацыянальная ідэалогія.

Русіфікацыя і этнакультурная уніфікацыя ўспрымаліся ўрадавымі коламі Расійскай імперыі ў 60–90-х гг. XIX ст. як неабходны элемент мадэрнізацыі.

У перыяд пасля вызвалення сялян і рэформ 1860–1870-х гг. павялічыліся памеры добраахвотнай русіфікацыі. Чыгуначнае будаўніцтва, развіццё прамысловасці і ўнутранага рынку, удасканаленне камунікацый, пашырэнне перспектыў прафесійнага росту і сацыяльнай мабільнасці стваралі новыя перавагі не толькі для рускіх, але і для прадстаўнікоў іншых народаў. Эмансіпацыя сялянства, індустрыялізацыя і урбанізацыя садзейнічалі фарміраванню сярэдняга слоя ў горадзе і вёсцы, які стаў сацыяльнай базай абуджэння і пашырэння нацыянальных рухаў[7]. Для некаторых этнічных ускраін (найперш – Польшчы) была характэрна ў параўнанні з расійскім цэнтрам апераджальная мадэрнізацыя, якая прывяла да стварэння тут новых нацый, разгарнуўшых барацьбу не пад саслоўнымі ці тэрытарыяльнымі сцягамі, а пад нацыянальнымі.

Тэхналагічна працэс мадэрнізацыі быў звязаны з пераходам і пашырэннем фабрычна-заводскай індустрыі, з'яўленнем і ўкараненнем у вытворчасці машын. Колькасць фабрык і заводаў у Беларусі за 60–90-я гг. XIX ст. павялічылася ў 15 разоў і склала к канцу стагоддзя 1137 [8]. Аб'ём вытворчасці ўзрос у 37 разоў. Сродкі вытворчасці ў гэты час склалі 32 % ад усёй прамысловай прадукцыі Беларусі[9], што некалькі ніжэй, чым сярэдні (40 %) па Расійскай імперыі, але трэба ўлічваць традыцыйную спецыялізацыю прамысловасці Беларусі па перапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, мясной і мінеральнай сыравіны, характэрную для яе амаль да сярэдзіны XX ст. Індустрыяльнае развіццё Беларусі адбывалася нераўнамерна. У перыяд 60–70-х гг. XIX ст. ніякіх істотных змен не назіралася, больш заўважнымі яны сталі пачынаючы з 1880-х гг., асабліва глыбокія пераўтварэнні адбыліся к канцу XIX ст.

Адным з магістральных працэсаў мадэрнізацыі, які падштурхоўваўся прамысловым развіццём, стала урбанізацыя, уключыўшая вытворчы бок, структуру заняткаў і рассяленне людзей, змены ў вобразе жыцця, менталітэце насельніцтва і інш. Горад павінен быў цягнуць да адпаведнай цывілізацыі навакольны сельскі асяродак. Павелічэнне ўдзельнай вагі гарадскога насельніцтва ў Беларусі адбывалася нязначнымі тэмпамі: з 10,4 % у 1863 г. да 11,0 – у 1913 г.[10] Рост гарадоў Беларусі стрымлівалі асаблівасці тэрытарыяльнага размяшчэння і спецыялізацыі мясцовай прамысловасці, а таксама накірунак урадавай палітыкі (умацаванне рысы аседласці яўрэяў, штучнае абмежаванне надання афіцыйнага статуса горада населеным пунктам і інш.). У Беларусі менш адчувальна праявіўся ўплыў сялянства на сацыяльную мабільнасць гарадскіх груп жыхароў. На мяжы XIX–XX ст. істотнай была раз'яднанасць сацыяльных працэсаў у горадзе і на вёсцы Беларусі.

Пад уплывам мадэрнізацыі эканомікі адбываўся працэс трансфармацыі сацыяльнай структуры і сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства. Узнікалі класы буржуазнага грамадства, павялічваўся ўзровень тэрытарыяльнай і сацыяльнай мабільнасці насельніцтва. Спадчынны саслоўны статус паступова выцясняўся індывідуальным дасягненнем, паглыбілася і ўскладнілася сацыяльная іерархія грамадства. Аднак азначаныя працэсы не завяршыліся ў Беларусі нават падчас імклівых змен у пачатку XX ст. Саслоўнае паходжанне яшчэ ўплывала на фарміраванне асобных сацыяльных груп. Напрыклад, стварэнне чыноўніцкага апарату адбывалася двума шляхамі: па праву паходжання і па пэўнаму адукацыйнаму цэнзу. Існавалі абмежаванні пры прыёме на дзяржаўную службу для яўрэяў і католікаў. У прамысловасці Беларусі працавала ў пачатку XX ст. 237 тыс. рабочых – каля трох працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва. Рабочы клас у значнай ступені складаўся не з патомных рабочых, а з учарашніх сялян ці збяднелых рамеснікаў, гандляроў.

Выключнае значэнне для лёсу мадэрнізацыі мелі сацыяльна-культурныя трансфармацыі: секулярызацыя адукацыі і пашырэнне пісьменнасці, з'яўленне аўтаномнай асобы, фарміраванне грамадзянскай супольнасці і інш. Паводле падлікаў М.М. Улашчыка, у 1897 г. у Беларусі ўдзельная частка пісьменных людзей сярод дарослых і дзяцей за дзесяць гадоў складала

25,9 %, у тым ліку сярод мужчын – 36,4, жанчын – 15,2 %[11]. Доля пісьменных у гарадах састаўляла 46 %. У Беларусі ў 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. узнікаюць і пашыраюцца легальныя добраахвотныя таварыствы: сельскагаспадарчыя, ашчадныя касы, кааператывы, культурна-асветніцкія, спартыўныя, пажарныя арганізацыі і многія іншыя. Грамадскія арганізацыі аказвалі станоўчае ўздзеянне на развіццё некаторых сфер эканомікі, пашырэнне рацыяналізацыі метадаў гаспадарання, прафесіяналізацыю розных відаў дзейнасці, распаўсюджванне навуковых ведаў і культуры. Яны садзейнічалі выхаванню грамадзянскай самасвядомасці і самаарганізацыі людзей. Аднак расійскі ўрад, які пайшоў па шляху рэформ, не змог справіцца з радыкалізацыяй грамадскай свядомасці. Пагроза рэвалюцыйнага ўздыму з'яўлялася наступствам выхаду з-пад кантролю мадэрнізацыйных працэсаў. У гэтых умовах урад пайшоў па шляху палітычных рэпрэсій супраць рабочага, сацыялістычнага і нацыянальнага рухаў, а таксама культурнай русіфікацыі. Палітыка была скіравана не на інтэграцыю, а на сегрэгацыю і дыскрымінацыю асобных груп насельніцтва Беларусі (яўрэяў, палякаў, католікаў і інш.).

Новы этап мадэрнізацыі Беларусі храналагічна можна вызначыць пачаткам XX ст. Ён прыпадае на пераход да імперыялістычнай стадыі развіцця буржуазнага грамадства. Доўгі час у айчыннай гістарычнай навуцы імперыялізм успрымаўся як завяршальная стадыя капіталізму. У апошняе дзесяцігоддзе даследчыкі імкнуліся пазбягаць упамінання аб ім, успрымаючы гэты тэрмін як ідэалагічны штамп мінулага. Новы этап мадэрнізацыі азнаменаваўся паскарэннем развіцця буржуазных працэсаў, узмацненнем іх уплыву на прамысловасць і урбанізацыю, ростам рабочага руху і актывізацыяй уздзеяння на грамадскае жыццё сацыялістычных партый і рухаў. Пачатак XX ст. у гісторыі Беларусі вызначаўся рэвалюцыйнымі падзеямі 1905–1907 гг., прамысловым крызісам, правядзеннем аграрнай і земскай рэформ, нацыянальна-культурным уздымам і інш. Названыя працэсы садзейнічалі пашырэнню прасторы мадэрнізацыі Беларусі, асобныя элементы якой спалучаліся тут з перажыткамі прыгонніцтва, захаваннем саслоўнай сістэмы, перакосамі ва ўзаемаадносінах паміж горадам і вёскай, але не набылі сістэмнага характару.

[1] Гл.: Apter D. The Politics of Modernization. Chicago, 1966; Black C. The Dynamics of Modernization. A Stady in Comparative History. New York, 1966; Eisenstadt S. Modernization: Protest and Change. New Jersey, 1967.

[2] Поткина И.В., Селунская Н.Б. Россия и модернизация (В прочтении западных ученых) // История СССР. 1996. № 4; Опыт российских модернизаций XVIII–XX веков. М., 2000; Российская модернизация XIX–XX веков: Институциональные, социальные, экономические перемены. Уфа, 1997; Каспэ С.И. Империя и модернизация: Общая модель и российская специфика. М., 2000.

[3] Бич М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. Мн., 1983; Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860–1900. Мн., 1978; Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971; Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Мн., 1990; Панютич В.П. Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861–1914 гг. Мн., 1996; Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX. Мн., 1980; Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Мн., 1962; Шыбека З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў). Мн., 1997.

[4] Гл.: Хобсбаум Э. Век империи. 1875–1914. Ростов н/Д., 1999. С. 28; Гиндин И.Ф., Иванов Л.М. О неравномерности развития российского капитализма: По поводу книги "Экономика Белоруссии в эпоху империализма" // Вопросы истории. 1965. № 9. С.135.

[5] Каспэ С.И. Указ. тв. С. 140.

[6] Там жа. С. 145.

[7] Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.): В 2 т. СПб., 1999. Т. 1. С. 43.

[8] Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860–1990. С. 133, 186, 187.

[9] Там жа. С. 134.

[10] Шыбека З.В. Указ. тв. С. 59.

[11] Улащик И.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1. С. 109.

Паступіў у рэдакцыю 21.10.2003.

*Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.